сельсавета Грэскага р-на Слуцкай, з 9.6.1927 да 26.7.1930 Мінскай акруг. З 24.1.1929 да 27.9.1938 зноў мястэчка. З 8.7.1931 у Капыльскім, з 12.2.1935 зноў у Грэскім р-нах, з 21.6.1935 Слуцкай акругі. З 20.2.1938 у Мінскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 29.6.1941 да 1.7.1944 Г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія знішчылі тут 612 чал. З 20.9.1944 у Бабруйскай, з 8.1.1954 у Мінскай абласцях. З 17.12.1956 зноў у Капыльскім р-не. У 1971 — 189 гаспадарак, 587 ж. У 1997 — 197 гаспадарак, 481 ж.

У 2011 дзіцячы сад, сярэдняя школа, школа-інтэрнат, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі і ААТ «ААБ Беларусбанк», магазін. Брацкія магілы чырвонаармейцаў, якія загінулі летам 1920, сав. воінаў і партызан, што загінулі ў Вял. Айч. вайну. Магіла ахвяр фашызму. Археал. помнік – гарадзішча. Помнікі архітэктуры — сядзібны дом (1-я пал. 19 ст.), касцёл у гонар Зняцця з Крыжа Збавіцеля (1802), гандл. рады (2-я пал. 19 ст.), вінакурня (пач. 20 ст.).

**ГРОЗАЎСКІ СЯДЗІБНЫ ДОМ**, помнік архітэктуры ў в. Грозава Капыльскага р-на. Пабудаваны ў 1-й пал. 19 ст. з цэглы ў пейзажным парку (не захаваўся). Належаў Мержыеўскім, Вітгенштэйнам. Будынак сіметрычна-восевай кампазіцыі, 2-павярховы, прамавугольны ў плане, накрыты вальмавым дахам. Да зах. тарца прыбудавана аднапавярховая гасп. пабудова. Гал. фасад вылучаны 4-калонным порцікам, дваровы — глыбокім рызалітам. Фасады расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў прафіляваных ліштвах, нішамі, лапаткамі, аркамі. Планіроўка — анфіладна-калідорная з вестыбюлем, невял. тамбурам і квадратнымі ў плане вял. заламі 1-га і 2-га паверхаў. Знаходзіцца ў паўзруйнаваным стане.

**ГРОМ** Уладзімір Мікалаевіч (20.12. 1951, в. Сямурадцы Жыткавіцкага р-на — 10.12.2008), беларускі дзеяч аматарскага мастацтва. Засл. работнік культуры Беларусі (1986). Скончыў Мінскі ін-т культуры (1986). З 1982 арганізатар і маст. кіраўнік *Крупіцкага заслужанага аматарскага фальклорнага ансамбля «Крупіцкія музыкі»*. Збіраў для патрэб калектыву бел. нар. муз. інструменты (іграў на гармоніку, дудцы, жалейцы, дудзе, акарыне і інш.), рабіў фаназапісы ўзораў фальк. песеннай і інструм. творчасці, аранжыроўкі найгрышаў, папаўняў рэпертуар творамі кампазітараў 18—19 ст. (М.К.Агінскага, М.Ельскага, В.Казлоўскага, А.Абрамовіча і інш.). Апублікаваў зб-кі апрацовак нар. музыкі «Зайграйце, музыкі!» (1998), «Дударэньку-гаспадарэньку» (1999) і ўласных экспедыцыйных запісаў нар. песень «Сядзіць галубок над крыніцаю» (2001). Адзін з аўтараў кн. «Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах» (2005). *А.М.Карлюкевіч.*



*У.М.Гром.*

**ГРО́МАВА** Маргарыта Аляксееўна (25.12.1926, в. Рагінполь Смаленскай вобл., Расія — 28.5.2007), беларуская актрыса. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1951). Працавала ў Нац. акадэмічным тэатры імя Я.Купалы. Выступала ў розных амплуа — травесці, характарныя і камедыйныя ролі. Сярод лепшых роляў: Лёнька, Ганна Ісакаўна («Выбачайце, калі ласка!», «Верачка» А.Макаёнка), Янка Купала («Шчасце паэта» В.Віткі), Улляна («Адкуль грэх?» А.Петрашкевіча), Ганна («Вечар» А.Дударава), Грыпіна («Ажаніцца — не журыцца» Далецкіх і М.Чарота), Марфа («Дзядзечкаў сон» Ф.Дастаеўскага), Поля («Характары» В.Шукшына), Марыяна («Канец — справе вянец» У.Шэкспіра). *Р.І.Баравік.*

**ГРО́МАЎ** Уладзімір Валер'евіч (н. 23.8.1973, г. Баранавічы), беларускі артыст оперы (барытон). Засл. артыст Беларусі (2012). Скончыў Бел. акадэмію музыкі (2002). З 2000 у Нац. акадэмічным Вял. тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Сярод оперных партый: Рыгалета, Аманасра, Рэната («Рыгалета», «Аіда», «Баль-маскарад» Д.Вердзі), Пінг («Турандот» Д.Пучыні), Фігара («Севільскі цырульнік» Д.Расіні), Граф («Вяселле Фігара» В.А.Моцарта), Сільвіа («Паяцы» Р.Леанкавала), Маралес («Кармэн» Д.Бізэ), Анегін, Томскі («Яўген Анегін», «Пікавая да-



*Грозаўскі сядзібны дом.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ